ДзУК “Зэльвенская раённая бібліятэка”
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя: **Фальклорная старонка Зэльвеншчыны**

# Прыказкі і прымаўкі Зэльвеншчыны

***паводле анталогіі “Беларуская народная творчасць”***

***Інфармацыйна-краязнаўчы буклет***

**Зэльва, 2018**

**ДзУК "Зэльвенская раённая бібліятэка"**
**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі**

Серыя: **Фальклорная старонка Зэльвеншчыны**

# Прыказкі і прымаўкі Зэльвеншчыны

**Інфармацыйна-краязнаўчы бюлетэнь**

**Зэльва, 2018**

# ПРЫРОДА, ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ПРАЦА

**471.** Асенняе сонца, як удаўцова сэрца *М.Шлык, 1969*

**582.** На Новы рок прыбудзе дня на зайчын скок. *“ШМ”, №1.*
*Вар.:А.Рахунок,1967,Зельв.13.10.24.*

**592.** Як на грамніцы нап’ецца певень вадзіцы, то на Юр’я наесца вол травіцы. *Сцяшк., 617, Зельв.: Смурага, 1967,Свісл. 13.10.28.*

**707.** Калі на Пятра пойдзе дождж, будзець жыта, як хвошч. Tuszk., *Нос., 64, Вар,: А. Рахунак, 1967, Зельв,13.10.24.*

**790.** Пакрова - зарыкала ў хляве карова.
*М. Шлык, 1969.Зельв.*

**869.** Слабая ніўка дасць больш, чым багаты гаспадар. *М. Шлык,1969.*

**909.** Злятайцеся, вароны, на гультаёвыя загоны.*М. Шлык, 1969.*

**1007.** Сей гарох, каб баран лёг. *Сцяшк., 608.*

**1584.** Хто не ляніцца, той справай сваёй ганарыцца. *Н. Рында, 1967,Зельв. 13.10.23*

**1598.** З адкладу няма ладу. *Сцяшк.,590, Астр.; А. Рахунак, 1967,Зельв. 13.10.24.*

**1713.** Грэе не шуба, а работа. *М. Бандарэнка, 1966, Маз.13.3.29; Н. Рында,1967,Зельв. 13.10.23*



# МАТЭРЫЯЛЬНЫ БЫТ

**89.** Рубі стаўбы - забор сам паваліцца.*Н. Рында, 1967,Зельв, 13.10.23.*

**379.** Пара касцей не ломіць, гушча дзяцей не разганяе.*М. Шлык, 1969, Зельв.*

**879.** Як мукі скрыня, то і кошка гаспадыня, Сцяшк.,617, Зельв. Вар.:А. Ліс, 1968,Смарг.

**931.**Лішняга то і свіння не есць. *Сцяшк.,597,Зельв.*

**962,** Каб не ежка, не адзежка, то была б грошай дзежка. *Дуб.,26,Вар,: Сержп.,49; А.Рахунак, 1967, Зельв.13.10.24; Я.Шмыгіна, 1965, Навагр,13.10.28.*

**1234.** Хта напрамкі лятае, той дома не бывае.*Сцяшк., 614,Зельв.*



# ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

**166.** Былі б дуракі, а паны знойдуцца. *Н. Рында, 1967, Зельв. 13.10.23.*

**195.** Калі пан смяецца - мужык плача. *Н. Рында. 1967, Зельв. 13.10.23.*

**449.** Не так будзе, як пан кажа, а так будзе, як мужык зробіць. *Ахрым.,15; Рында,1967, Зельв.13.10.23.*

**557.** Новы поп - новае маленне.*А. Хутко, 1966, Зельв. 13.10.26.*

**1595.** Тагды маю, калі ў руках трымаю. *Нос., 162; Сах; А. Рахунак, 1967, Зельв.13.10.24.*

**1625.** Мужык многа працуе, ды нічога не мае. *Н. Рында, 1967,Зельв.13.10.23.*

**1684.** З даўгімі рукамі - пад касцёл. *М. Шлык, 1969,Зельв.*

**1690.** Пакуль сыты ссохне, то худы здохне. *Дразд.; А. Рахунак. 1967.Зельв. 13.1024.*

**1983.**Чужую бяду па валасу развяду, а сваю - ума не забяру. *А. Фядосік, 1959, Капатк. 8.1.76. Вар.: Н. Рнда, 1967, Зельв. 13.10.23.*

**2305.** Сіла ёсць - розуму не трэба. *А. Хутко, 1966, Зельв.13.10.26.*

**2468.** Даюць, да з рук не выпускаюць. *Вар.: А. Рахунак, 1967, Зельв.13.10.24.*

# СЯМ'Я І СЯМЕЙНЫ БЫТ

**78.** Дзявочы век як макаў цвет. *М. Шлык, 1969,Зельв.*

**136.** Не нашаму цяляці (шчаняці) воўка спаймаці. *Шейн II, 479,Барыс,п, М.Шлык, 1968, Зельв.;*

**355.**Таткава хата ўсім багата. *Нос.,161; Дуб,.52; Сцяшк.,610, Зельв.; С. Палікоўская,1965,Воран.13.10.1; А.Гурскі, 1971, Паст.8.2.46.*

**621.** Мужык хай будзе, як долата, абы ты за ім была, як золата. *Сцяшк., 598, Зельв., І. Цішчанка, 1971, Брасл.8.2.49.*

**1142.** Сіраце дакіпіць і ў жываце. *Янк. М.,19, Вар.; А. Фядосік, 1962, Капатк.8.1.76; А. Хутко, 1966, Зельв, 13.10.26.*

**1489.** Не слухае ківа, паслухае кія. *Ром,. Бел.І, 304; Ляцкій,30, Вар.; А. Рахунак, 1967, Зельв, 13.10.24.*

**1546.** Вялікага роду, да нарабіў (радне) смроду. *А. Рахунак, 1967, Зельв, 13.10.24.*

# ЧАЛАВЕК І ЯГО ЯКАСЦІ. МАРАЛЬ

**92.** Глухі  чаго не дачуе, дак прыложыць, *Дуб., 11Сержп., 36, Вар.: Сцяшк., 585, Іў; А. Хутко, 1966, Зельв. 13.10.26.*

**338.** Калі з чупрыны гінуць валасы, то і памяць - з галавы, *А. Хутко, 1966, Зельв, 13.10.26*

**367.** Важна смеласць, але патрэбна і ўмеласць, *П. Рында, 1967, Зельв.13.1023.*

**489.** Сам харошы, а розуму няма і на два грошы.*В. Ярмак, 1966, Зельв. 13.10.26.*

**784.** Грозен рак, да ззаду вочы. *Нос.,29; Л.Царанкоў, 1960, Мінск 13.9.24А. Рахунак, 1967, Зельв.13.10.24.*

**823.** Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш. *П. Рында, 1967, Зельв.13.10.23.*

**1050.** Гультай за дзела - мазоль на цела. *Сцяшк., 586,Зельв.; М.Мельнічэнка, 1950,Гом., 13.3.29*

**1089.** Габлюй, габлюй, сынок, прыдзе бацька - сякерай паправіць. *Сцяшк., 384,Зельв.*

**1147.** Так-сяк накасяк, абы не па-людску. *Рахунок 1967, Зельв.13.10.24.*

**1154.** Смелага страх не возьме і вораг не паб'е. *П. Рында, 1967,Зельв.13.10.23*

**1508.** З воч іскры сыплюцца, а з языка мёд цячэ. *Сцяшк., 590,Зельв.*

**2123.** Хто парася ўкраў, таму ў вушах пішчыць (вішчыць*). П.Рында, 1967, Зельв.13.10.23.*

**2512.** Смех без прычыны - прызнак (адзнака, знак) дурачыны. *Сцяшк.,609, Зельв.*

# ПРЫКАЗКІ  І ПРЫМАЎКІ САВЕЦКАГА ЧАСУ

**106.** Масквою-сталіцай ўся краіна ганарыцца. *П. Рында, 1967, Зельв,13,10.23.*

**193.** Што заваявала рэвалюцыя, тое пацвердзіла Канстытуцыя. *Н. Рында, 1967, Зельв.13.10.23.*

**196.** Што аднаму не пад сілу, тое лёгка калектыву. *Н. Рында,1967,Зельв.13.10.23.*

**597.** Даў (дасі) фашысту ў рабро - зробіш сабе дабро. *А. Рахунак, 1967.Зельв.13.10.24.*



## Змест:

**ПРЫРОДА, ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ПРАЦА- С.**
**МАТЭРЫЯЛЬНЫ БЫТ---------------------------------------С.**
**ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ-------------------------------------С.**
**СЯМ'Я І СЯМЕЙНЫ БЫТ----------------------------------С**
**ЧАЛАВЕК І ЯГО ЯКАСЦІ. МАРАЛЬ----------------------С.**
**ПРЫКАЗКІ  І ПРЫМАЎКІ САВЕЦКАГА ЧАСУ--------С.**

Складальнік: Мацкевіч (Сляўка) С.М.
Рэдактар: Масюк В.Л.
Адказны за выпуск: Жамойціна С.А.
Камп'ютарны набор і апрацоўка:
Мацкевіч (Сляўка) С.М., Масюк В.Л.
Падрыхтаваны да друку: 09.04.2018
Заказ:
Тыраж: 4 экз.